# ГАРАДЗІШЧА ПЕРЫЯДУ РАННЯГА ЖАЛЕЗНАГА ВЕКУ (СМАЛЯВІЦКІ РАЁН, В. КАМЕНКА)

**Шыфр гісторыка-культурнай каштоўнасці (паводле дзяржаўнаму спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь):** 613В000578

**Месцазнаходжанне:** Смалявіцкі раён, в. Каменка

**Апісанне:**

Гарадзішча перыяду ранняга жалезнага веку каля в. Каменка Смалявіцкага раёна – помнік археалогіі (**613В000578**).

Адкрыты ў 1925 г. Абследван у 1979 г.

Прыкладна з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя да н.э. пачалася эпоха ранняга жалезнага веку. Людзі навучыліся здабываць і апрацоўваць жалеза, сыравінай для атрымання жалеза былі шырока распаўсюджаныя балотныя руды. Адкрыццё жалеза стала пачаткам тэхнічнага перавароту ў гісторыі чалавецтва.

У гэтыя часы развівалася падсечаная сістэма земляробства. Ссечаныя дрэвы спальвалі і попелам угнойвалі глебу. Некалькі гадоў запар такім чынам атрымлівалі добры ўраджай, вырошчвалі пшаніцу, проса, боб, гарох. Потым дзялянку пакідалі і пераходзілі на іншую.

У раннім жалезным веку сярэднюю частку Беларусі і ўсходнюю Літву насялялі носьбіты культуры штрыхаванай керамікі (назва паходзіла ад таго, што посуд пакрывалі штрыхоўкай), якая аформілася на базе мясцовай культуры эпохі бронзы. Гаршкі ляпілі вастрарэбныя і слоікападобныя. У тыя часы працягвала развівацца бронза-ліцейная справа. Шмат рабілі ўпрыгожванняў, сярод якіх фібулы (зашпількі для адзення), бранзалеты, скроневыя кольцы.

На гарадзішчах ранняга жалезнага веку людзі жылі ў пабудовах слупавой канструкцыі і ў паўзямлянках, якія рабілі з бярвення. Абаграваліся яны печкай-каменкай або адкрытым агнішчам. Жыхары такіх паселішчаў займаліся земляробствам, жывелагадоўляй, паляваннем і рыбалоўствам.